Для качественной оценки трудового потенциала нами исследована численность занятых по видам экономической деятельности, по уровню образования, по форме собственности организаций, где заняты трудовые ресурсы, по возрасту и полу и др. что более детально будет проанализировано в дальнейших исследованиях.

**Заключение.** Подводя итоги исследованию, можем утверждать: во-первых, количество трудовых ресурсов в нашей стране, к сожалению, сокращается с каждым годом в среднем на 50 тыс. чел.; во-вторых, наблюдается закономерный процесс увеличения занятости на 1%; в-третьих, количество трудовых кадров с высшим образованием увеличивается и напротив, снижается количество лиц, имеющих профессионально-техническое образование; в-четвертых, средний возраст работников 42,3 года. В целом, качественные и количественные показатели трудового потенциала Республики Беларусь имеют возможности для повышения конкурентоспособности национальной экономики на мировом рынке.


1. Национальный статистический комитет Республики Беларусь //Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2020 [Электронный ресурс]. – Республика Беларусь, 2020. – Режим доступа: https://belstat.gov.by/upload/iblock/c68/c68ec3c1ac53374bedc363044769f2c1.pdf. –Дата доступа: 05.03.2021.
2. Национальный статистический комитет Республики Беларусь //Труд и занятость в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Республика Беларусь, 2020. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/c17/c1758aafc21ec069dafba92b27dea768.pdf. – Дата доступа: 05.03.2021.


# ГІСТОРЫЯ РОСІЦКАГА КАСЦЁЛА СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ Ў XX – ПАЧАТКУ XXI ст.


***Колзун В.В.,***

*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Косаў А.П., канд. гіст. навук, дацэнт


Актуальнасць выбранай тэмы абумоўлена нешматлікімі сучаснымі даследаваннямі ў айчыннай гістарыяграфіі беларускай рэлігійнай культуры, гісторыі асобных парафій, у тым ліку, гісторыі Росіцкага касцёла.

Мэта работы – даследаваць гісторыю Росіцкага касцёла Святой Тройцы ў XX – пачатку XXI ст.

**Матэрыялы і метады.** Даследаванне пабудавана на выкарыстанні дакументаў, выдадзеных Рыма-каталіцкім Касцёлам, а таксама навуковых публікацый, што дазволіла разгледзець гісторыю парафіі Святой Тройцы ў Росіцы у XX – пачатку XXI ст. Метадалагічную аснову публікацыі склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя, так і спецыяльна-гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Росіца – невялікае мястэчка ў Верхнядзвінскім раене Віцебскай вобласці. Гісторыя цяперашняга касцёла ў Росіцы даволі добра задакументаваная. Першая каталіцкая святыня, пра якую ёсць дакладныя звесткі, паўстала дзякуючы Мікалаю Лапацінскаму, берасцейскаму ваяводу, які ў 1753 г. набыў Росіцу разам з Сар’яй у Сапегаў. Перад сваей смерцю ў 1778 г. ён фундаваў будаўніцтва касцела. Будову храма працягваў яго сын Тамаш-Ігнат. Драўляны касцёл быў асвечаны ў 1792 г. родным братам Тамаша – біскупам Юзафам Лапацінскім. Яго асвяцілі пад тытулам Святой Тройцы, Святога Юзафа і Сэрца Езуса. З цягам часу драўляная святыня не магла задаволіць патрэбы Росіцкай парафіі, якая напрыканцы XIX ст. налічвала 6000 чалавек, а ў 1901 г. – 7382 верніка і была найвялікшай у Віцебскай губерніі [1, с. 439].

14 чэрвеня 1905 г. Магілеўская Рыма-каталіцкая Духоўная Кансісторыя дала дазвол на будаўніцтва новага каменнага касцёла. 20 снежня 1911 г. ён быў асвечаны пад тытулам Сэрца Езуса і Святога Антонія з Падуі. Храм пабудавалі побач з драўлянай святыняй, якая ў незабаве была разбурана. Лічба вернікаў у 1917 г. складала 8300 чалавек. У 1934 г. наступае сумны этап у існаванні росіцкай святыні. Храм зачынілі, а тагачаснага настаяцеля – ксяндза Эдварда Вайцяховіча (1884–1935) арыштавалі і асудзілі “асобай нарадай” пры НКУС за “антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць”, а пасля расстралялі. У 1940 г. з росіцкага касцёла знялі вежы, а сам будынак пераабсталявалі пад сельскі клуб.



Репозиторий ВГУ

Адраджэнне рэлігійнага жыцця стала магчымым з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Росіцкія вернікі запрасілі да сябе на служэнне святароў з Друйскага кляштара айцоў-марыянаў (МІС), дзе на той момант працавала 5 святароў [2, с. 305–306]. Кіраўніком духоўнай місіі быў прызначаны айцец Антоній Ляшчэвіч (МІС). Разам са святаром для місійнай дзейнасці ў Росіцу прыехалі манахіні з Кангрэгацыі Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі (так званыя эўхарысткі). Айцец Антоній Ляшчэвіч распачаў сваю духоўную місію: ездзіў па наваколлі, засноўваў капліцы, дзе манахіні вучылі катэхізісу, а ў нядзелю і святы адбывалася Літургія. Акрамя Росіцы, святары праводзілі місіянерскую дзейнасць і ў навакольных парафіях: Замошша, Асвея, Баліны і іншыя. Частка гэтых парафій знаходзілася ў зоне дзейнасці партызанаў (Асвея, Замошша), іншыя – акупантаў (Дрыса, Бігосава), аднак айцу Ляшчэвічу, які актыўна праводзіў місіянерскую дзейнасць у наваколлі, не перашкаджалі ні акупацыйныя ўлады, ні партызаны. 22 ліпеня 1942 г. на дапамогу ў душпастырскай дзейнасці айцу Антонію ў Росіцу прыязджае айцец Юрый Кашыра (МІС).

Летам 1942 г. партызаны актывізавалі сваю дзейнасць у наваколлі. У снежні, перад святам Божага Нараджэння, айцец Антоні Ляшчэвіч быў папярэджаны, што неўзабаве тут адбудзецца карная акцыя супраць партызанаў і мясцовага насельніцтва, якое іх падтрымлівала. У выніку ксяндзы выехалі ў Друйскі кляштар, дзе было вырашана, што святары і манахіні самі павінны вырашыць пытанне аб сваім далейшым знаходжанні на гэтай тэрыторыі, але застацца вырашылі ўсе. У лютым 1943 г. айцы Антоній і Юрый прынялі страшную смерць: падчас карнай аперацыі «Зімняе чараўніцтва» немцы спалілі іх разам з больш як 1500 вернікамі. Карнікі прапаноўвалі святарам уратавацца, для гэтага яны павінны былі пакінуць сваю паству, святары ж на гэта не згадзіліся. 17 лютага мучаніцкую смерць прыняў айцец Антоні Ляшчэвіч, ён быў расстраляны, а 18 лютага загінуў у агне пажару айцец Юрый Кашыра [3].

У выніку карнай аперацыі была спаленая ўся вёска, ацалеў толькі росіцкі касцёл, у якім пасля вайны былі клуб, стайні, склад збожжа, млын. Мясцовыя вернікі ўвесь час спрабавалі змагацца за вяртанне сваей святыні, але адраджэнне рэлігійнага жыцця стала магчымым толькі дзякуючы зменам у грамадстве напрыканцы 1980-х гг. З 1988 г. кс. Антоній Лось (памёр 23.08.2001 г.) распачаў у Росіцы душпастырскую дзейнасць і рамонт святыні, якая набыла тытул Найсвяцейшай Тройцы. Рэкансэкрацыю росіцкай святыні правеў кс. біскуп Уладзіслаў Блін 19 жніўня 2000 г 13 чэрвеня 1999 г. Папа Рымскі Ян Павел II далучыў да ліку благаслаўленых 108 пакутнікаў часоў Другой сусветнай вайны, сярод якіх знаходзіліся айцец Антоні Ляшчэвіч і айцец Юрый Кашыра. Пасля аднаўлення святыні тут служылі: айцец Антоній Лось МІС (малодшы), айцец Петр Бярнацкі МІС, айцец Петр Срока МІС, айцец Вячаслаў Пялінак МІС, айцец Аляксандр Шамрыцкі МІС, айцец Генрых Кулеша МІС.

З 1 верасня 2007 г. працуе айцец Чэслаў Курэчка МІС. Сучасны Росіцкі касцёл наведваюць высокія дзяржаўныя асобы і валанцёры з розных куткоў краіны, у Росіцу прыязджаюць экскурсіі з блізкага і дальняга замежжа, сюды прыбываюць тысячы пілігрымаў з усяго свету. Заслугі Ч. Курэчкі за ўклад у захаванне міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды, актыўны ўдзел у духоўна-асветніцкай дзейнасці і прапагандзе здаровага ладу жыцця адзначаны ў 2016 г. прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" [4].

**Заключэнне.** Росіцкі касцёл мае багатую і глыбокую гісторыю: ён перажыў этапы росквіту і ўпадку, стаў сведкам трагічных падзей і атрымаў як узнагароду новых святых беларускай зямлі. У выніку даследванняў гісторыі Росіцкага касцёла былі вылучылі наступныя этапы: першы этап – гэта станаўленне парафіі, асвячэнне новага касцёла ў 1911 г. Другі этап звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, калі стала магчымым адраджэнне рэлігійнага жыцця, але разам з тым адбылася Росіцкая трагедыя. Трэці этап – ад пасляваеннага перыяду заняпаду рэлігійнага жыцця Росіцкага касцёла – да аднаўлення ў 1988 г. Чацвёрты сучасны этап, распачынаецца ў 1988 г. рамонтам святыні і аднаўленнем рэлігійнага жыцця. Гэты перыяд доўжыцца да сённяшніх дзён.


1. Zyskar,. J. Ks. "Nasze koscioly" / J. Ks. Zyskar // Archidiecezja Mohylowska/ witebszczyzna, 2001. – T. 1, cz. 3. – 443 s.
2. Лаўрыненка, К. В. Віцебская Дыяцэзія Рыма-Каталіцкага Касцела ў Беларусі. Дыяцэзіяльны даведнік / К. В Лаўрыненка. – Мінск : Медысонт, 2019. – 347 с.
3. Bukowicz, Jan MIC, ks. Błogosławiony ksiądz Jerzy Kaszyra / Jan Bukowicz. – Włocławek : Wydawnictwo duszpasterstwa rolników, 2001. – 55 s.
4. Святар з Віцебскай дыяцэзіі стаў лаўрэатам лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне" // Каталіцкі Веснік. – 2016. – № 1 (58). – С. 3.




Репозиторий ВГУ